СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Бібліятэка
АН БССР

Прачытаў—перадай другому.

# НАРОДНЫ МСЦІЎЕЦ

Орган Окцябрскага РК КП(б)Б

№ 22 (43) | Субота, 21 жніўня 1943 г. | II г. выд.

**За пяць дзён баёў з 16 па 20 жніўня ўключна нашы войскі вызвалілі ад нямецкіх акупантаў звыш 230 населеных пунктаў, у тым ліку гарады КАРАЧЭУ, ЖЫЗДРА, ЗМІЕЎ, ЛЕБЯДЗІН.**

# ЗАГАД
## Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

15 жніўня гэтага года ў выніку ўпорных баёў 16-я і 84-я Гвардзейскія стралковыя дывізіі, 238-я і 369-я стралковыя дывізіі вызвалілі горад КАРАЧЭЎ ад нямецкіх захватчыкаў, паказаўшы пры гэтым абразцы мужнасці і ўмелых баявых дзеянняў.

У азнаменаванне дасягнутых поспехаў 16-й і 84-й Гвардзейскім стралковым дывізіям, 238-й і 369-й стралковым дывізіям, вызваліўшым горад КАРАЧЭЎ, прысвоіць найменаванне „Карачэўскіх" і ў далейшым іх іменаваць:

16 Гвардзейская Карачэўская стралковая дывізія.

84 Гвардзейская Карачэўская стралковая дывізія.

238 Карачэўская стралковая дывізія.

369 Карачэўская стралковая дывізія.

**Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Савецкага Саюза І. Сталін.**

15 жніўня 1943 г.

## На франтах Айчыннай вайны

Чырвоная Армія прадаўжае гнаць немцаў на захад. Фронт наступлення нашых войск расшырыўся больш чым на 500 км. На ўсіх напрамках Чырвоная Армія паспяхова развівае пабеданоснае наступленне. Выбіўшы немцаў з Спас-Дземенскага плацдарма, савецкія войскі прасоўваюцца ўперад і вызваляюць усё новыя і новыя населеныя пункты. Страціўшы выгадныя для абароны рубяжы, немцы нясуць вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы. За 16 і 17 жніўня на гэтым участку было знішчана больш 5.000 нямецкіх салдат і афіцэраў, да 100 гармат, каля 30 танкаў, захвачаны трафеі і палонныя.

Наступленне нашых войск у раёне Спас-Дземенска значна аслабіла пазіцыі немцаў у паўночным сектары Бранскага напрамку. 18 жніўня на гэтым участку нашы войскі занялі горад Жыздра, з'яўляўшыйся моцным умацаваным вузлом немцаў. Паўночнее, усходнее і паўднёвае Бранска нашы войскі прадаўжаюць паспяхова прасоўвацца. За 16 і 17 жніўня на гэтых напрамках занята больш 190 населеных пунктаў. 18 жніўня баі ішлі ў 30 км. усходнее Бранска.

На Харкаўскім напрамку працягваюцца ўпорныя наступальныя баі нашых войск, якія адбіваюць таксама контратакі ворага. Страціўшы важныя камунікацыі заходнее і паўднёва-заходнее Харкава, немцы спрабуюць вярнуць іх. Але пад нарастаючымі ўдарамі нашых войск вымушаны пяціцца назад і нясуць пры гэтым нябачаныя страты. Асабліва цяжкія страты немцы панеслі тут 16 і 17 жніўня. За гэтыя два дні нашы байцы знішчылі заходнее Харкава да 7.000 гітлераўцаў і знішчылі каля 80 нямецкіх танкаў, большасць з якіх танкі тыпа „Тыгр". Страты настолькі каласальныя, што яны самі нават не могуць затаіць гэтага факта. Берлінскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што на аднаго забітага на Ўсходнім фронце прыходзіцца 9—10 раненых. Гітлераўская газета „Нэйбар Таг" прызналася: „На ўсіх франтах мы стаім перад пераўзыходзячымі сіламі праціўніка і павінны абараняць сваю шкуру. Мы павінны вынасіць усе цяжкія ўдары, і сур'ёзнасць становішча таіць не прыходзіцца".

### Завяршэнне ваенных дзеянняў на востраве Сіцылія

Як афіцыяльна паведамляецца, часці 8-ай англійскай арміі, прасоўваўшыеся ўдоўж узбярэжжа Сіцыліі з поўдня, злучыліся ў Месіне з амерыканскімі войскамі. Усякае супраціўленне праціўніка на востраве спынілася. Агенцтва Райтэр перадае, што самалёты саюзнікаў знішчылі і пашкодзілі ў час эвакуацыі з вострава Сіцылія праз Месінскі праліў 306 суднаў з войскамі праціўніка.

# Партызаны, партызаны, беларускія сыны! Рэжце гітлераўцаў паганых, каб не ўскрэслі век яны!

## Ніхто не верыць нямецкім фальшыўкам

Правалілася летняе наступленне нямецкіх войск на Усходнім фронце, якое, па планах германскага камандавання, лічылася рашаючым. Ім спадзяваліся немцы атрымаць перамогу над Чырвонай Арміяй. Пралічыліся нямецкія ваенныя стратэгі з сваім камандуючым Гітлерам.

За кароткі час чырвоныя войскі не толькі спынілі наступленне немцаў, але прадпрынятымі контрударамі пагналі іх на захад, вызваляючы тысячы населеных пунктаў і дзесяткі гарадоў. Над Орлам, Белгарадам, Чугуевым, Карачэвам, Зміевым і другімі вызваленымі гарадамі зноў развяваецца горды сцяг Саветаў.

А калі немцаў моцна б'юць, тады пачынае ўзмоцнена працаваць гебельсаўская фабрыка хлусні. Новыя фальшывыя лістоўкі раскідаюць тады нямецкія „асы" над вёскамі. У адной з такіх на скорую руку састрапаных лістовак фашысцкія горэ-пісакі пытаюць: хто разумней? Адказ просты: разумней той, хто не верыць гебельсаўскім пустабрэхам, а знішчае гітлераўцаў на кожным кроку. Самы неразумны той, хто піша ў лістоўках розную бязглуздзіцу. Сюды-ж трэба аднесці і тых, хто трапіў і завяз у карычневай фашысцкай павуціне і па-рабскі выслужваецца перад людаедамі за аб'едкі з іх стала.

Дарэмна стараюцца прыдаць выгляд раю нямецкаму канцлагеру фашысцкія прапагандысты, запрашаючы ў гэты „рай" партызан і чырвонаармейцаў. Яшчэ стаіць перад вачамі малюнак пажару ў Бабруйскім лагеры ваеннапалонных, дзе згарэлі да 18 тысяч палонных чырвонаармейцаў. Не забыты яшчэ і пагромы над безабароннымі людзьмі ў розных раёнах. Няма цяпер такіх людзей, каб паверылі зверам-гітлераўцам.

Народ верыць у другое, верыць, што ідзе Чырвоная Армія-вызваліцельніца, нясе свабоду савецкім народам і смерць акупантам. І ўсімі сіламі народ дапамагае граміць фашыстаў, змятаць іх з твару зямлі.

Ф. К.

## Любіць сваё аружжа

З першага дня ўступлення ў партызанскі атрад Пеця С. стаў кулямётчыкам станкавага кулямёта. Пеця любіць свайго сябра „максіма", старанна глядзіць за ім.

Не падводзіў кулямётчыка і кулямёт. Ва ўсіх баях удзельнічаў Пеця, скасіў дзесяткі гітлераўцаў, а „максім" ні разу не адказаў. За мужнасць і бясстрашнасць у баях савецкі ўрад узнагародзіў патрыёта Пятра С. медаллю „За адвагу".

Любоў к кулямёту прывіў Пеця і маладым партызанам. Ён падрыхтаваў некалькі кулямётных разлікаў.

МАКСІМ С. П.

## УДАРЫ па ЧЫГУНКАХ

Яшчэ з эшалоны ворага, пушчаныя пад адхос, запісалі на баявы рахунак падрыўнікі атрадаў т. т. П., Д., і А. Пры крушэннях разбіта 3 паравозы, 27 вагонаў з боепрыпасамі і харчаваннем, 7 платформ з тэхнікай, 4 цыстэрны з гаручым. Апрача гэтага, узарвана з чыгуначных масты па 10—12 метраў даўжынёй.

Р. П.

## Дыверсанты

Участак чыгункі ўзмоцнена ахоўваўся. Паблізу знаходзіўся дзот, ноччу шнырылі патрулі, але хлопцы рашылі: эшалон паляціць пад адхос. Прыкрытыя начной цемрай прабраліся на дарогу мінёры Павел П. і Аляксей Г. з камандзірам групы Д. Міна пастаўлена. Для лепшай не маскіроўкі зрабілі паблізу адзін узрыў, а самі адышлі. Раніцай рамонтнікі пастроілі пашкоджанае месца, і праз некаторы час пачуўся стук колаў поезда. Ледзь ён мінуў адрамантаванае месца, як раздаўся моцны выбух. Паравоз, 4 цыстэрны з гаручым і 7 платформаў з танкамі зніклі ў адхосе.

Заставаўся яшчэ адзін зарад, трэба выкарыстаць і яго. З надыходам цемнаты зноў з'явіліся на чыгунцы дыверсанты. Выслалі бакавыя аховы, і мінёры прыступілі да работы.

—Камандзір, немцы ідуць,— прашаптаў адзін з байцоў. Сапраўды, па чыгунцы ўбок дыверсантаў ішла група немцаў-ахраннікаў. Становішча стала крытычным. Але не разгубіўся камандзір, ён прадбачыў магчымасць такой „прыемнай сустрэчы" і прыняў неабходнае рашэнне. „У выпадку, калі мінёры не справяцца ўстанавіць міну, байцам аховы падпусціць немцаў на блізкую адлегласць і ва ўпор адкрыць агонь. Калі-ж мінёры выканаюць работу да набліжэння патрулёў—усім бясшумна знікаць з чыгункі,"—аддаў загад камандзір. Напружана, хутка працуюць мінёры. Міна закладзена, падпалены шнуры, і хлопцы знікаюць у начной цемнаце. На іскры-агеньчыка запаленых шнуроў кінуліся бегчы 8 гітлераўцаў. Толькі дабеглі, як раптам агеньчыкаў не стала. Гітлераўцы змітусіліся на адным месцы, кінулі ракету, адкрылі стральбу. Але праз момант усё патанула ва ўзрыве, патрасаючым наваколле. Узляцелі ў паветра шпалы, рэльсы і 8 гітлераўцаў.

МАРЫНА С.

Рэдакцыйная калегія.

Выданне Акцябрскага РК КП(б)Б.